---

# У бібліятэцы імя Леніна

Беларуская Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна ў Менску — першакласная культурная ўстанова, створаная за годы Савецкай улады. Яна па праву стаіць у радзе лепшых бібліятэк СССР. Старая, адсталая Беларусь, правінцыяльны Менск і марыць не маглі аб такой бібліятэцы. У ёй налічваецца зараз каля 2-х мільёнаў тамоў кніг — марксісцка-ленінскай, тэхнічнай, мастацкай літаратуры і т. д. Яна атрымлівае экземпляры ўсіх выходзячых кніг на мовах народаў СССР, газеты, журналы, шматтыражкі.

Штодзень з раніцы да вечара выдатныя чытальныя залы, бібліятэкі наведваюць 1000—1500 чалавек. Бібліятэка мае чытальныя залы для студэнтаў, для навуковых работнікаў, чытальню тэхнічнай літаратуры і кабінет рабочага чытача. Кабінет абслугоўвае рабочых, якія займаюцца самаадукацыяй у вячэрніх навучальных установах, школах дарослых без адрыву ад вытворчасці. Арганізоўваюцца кансультацыі, лекцыі, чыткі літаратуры непасрэдна на прадпрыемствах.

Вялікая дапамога аказваецца раённым бібліятэкам. Праз спецыяльны міжбібліятэчны аддзел чытачы з раёнаў могуць атрымаць з Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна патрэбную кнігу. Уведзен таксама і так званы паштовы абанемент. Чытачы з раёнаў могуць па пошце заказаць і атрымаць цікавячую іх кнігу. У буйнейшых гарадах рэспублікі — Віцебску, Гомелі і Магілеве працуюць філіялы бібліятэкі.

Зараз у бібліятэцы імя Леніна рыхтуюцца выстаўкі да 20-годдзя ленінска-сталінскага камсамола і да XXI гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.